# НА ПАРТЫЗАНСКАЙ, 19

## Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ля хаты, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны друкавалася найстарэйшая газета краіны, наведалі магілу яе падпольнага рэдактара Міхаіла Барашкава

**У вёску Камсамолец, што на Салігоршчыне, мы прыехалі позняй раніцай. Жыхар з суседняга Доўгага, наш падпісчык, сведчыў: тут пахаваны рэдактар партызанскай «Звязды» Міхаіл Парфёнавіч Барашкаў. Знайсці магілу было няцяжка. Яе, гэты адгалосак мінулай вайны, ведае кожны месціч. Ды і візуальна не заўважыць добраўпарадкаванае, абнесенае агароджай пахаванне, проста немагчыма...**


Супрацоўнікі падпольнай «Звязды» — друкар Емяльян ШУРПАЧ і рэдактар Міхаіл БАРАШКАЎ — за выпускам чарговага нумара газеты.

У прыгожым месцы спіць вечным сном рэдактар-партызан Міхаіл Барашкаў. Тут, наводшыбе, побач з лесам, чуеш, як спяваюць птушкі, стракочуць конікі. Быццам волатыахоўнікі, вартуюць воінскае пахаванне пяць векавых хвой. Тры — на кожную магілу ў агародку, дзве іншыя прытуліліся побач.

**Тое, што ў яе хаце некаторы час ствараліся газеты «Звязда» і «Чырвоная змена», Марыя Чарнюк памятае добра. Хоць, прызнаецца, самі газеты, якія выходзілі тады з-пад друкарскага станка, яна ніколі не бачыла.**




Так, тут пахаваны не адзін Барашкаў. Магіла партызанскага рэдактара — у цэнтры. Годны помнік расказвае выпадковым мінакам, хто ляжыць у гэтай зямельцы. Іншыя пахаванні – безымянныя.

### Загадка разгадана?

Магіла першага і — афіцыйна — адзінага рэдактара «Звязды»-партызанкі, а таксама ваеннай «Чырвонай змены» для многіх звяздоўцаў стала адкрыццём. Я, напрыклад, была цвёрда перакананая, што памерлага ад тыфу Міхаіла Парфёнавіча пахавалі дзесьці ў раёне вострава Зыслаў, што на Любаншчыне, — менавіта тут з 27 студзеня 1943 года і амаль да самага вызвалення сталіцы выходзіла наша газета. Праўда, ёсць адна дэталь.

У партызанскай зоне ўсяго выйшла 105 нумароў. Прычым на Любаншчыне «Звязда» ўбачыла свет 98 разоў. Вядома, што апошні нумар партызанскай газеты быў надрукаваны ў Слуцку. Дзе друкаваліся астатнія шэсць, застаецца здагадвацца.

А можа, загадка ўжо разгадана? Па-першае, адсюль, з вёскі Камсамолец, да знакамітага Зыслава – рукой падаць. Па-другое, наўрад ці рэдактар у той складаны ваенны час быў удалечыні ад сваёй рэдакцыі. Пра тое, што яна сапраўды некаторы час размяшчалася ў Камсамольцы, сведчыць адна шыльда. Прычым яна вельмі сімвалічна прымацавана на хаце з красамоўнай назвай — Партызанская, 19. Відаць, таксама невыпадкова. Як доказ — надпіс на шыльдзе: «У гады Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы Камсамолец знаходзіліся рэдакцыі падпольных газет «Звязда» і «Чырвоная змена».

І гэтая хата, на шчасце, не аказалася пустой. Больш за тое, гаспадары з часоў Вялікай Айчыннай тут не мяняліся...

### Жывая сведка

Калі мы падышлі да хаты, гаспадыня Марыя Чарнюк сядзела на лавачцы. Відаць, яе папярэдзілі, што прыедуць карэспандэнты, бо вясковы клопат не цярпіць адпачынку ў разгар светлавога дня.

Маленькая, худзенькая, яна прапанавала сесці побач. Я ўключыла дыктафон і прагна лавіла ўсе яе словы. Можа, яна — адзіная жывая сведка, якая памятае штосьці пра ваенную «Звязду» і яе рэдактара?

Надзею ўсяляла і тое, што Марыя Захараўна — карэнная жыхарка вёскі. Нарадзілася ў Камсамольцы 80 гадоў таму. Праўда, тады вёска называлася Радацень. Такую ж назву мела і ў гады вайны.

— Калі аб'явілі, што немцы блізка, усе паўцякалі ў лес, — успамінае Марыя Чарнюк. — А я маленькая была ды схавалася ў кусты, што каля балота. Ляжу і чую, плюхаюцьплюхаюць па вадзе дзесьці побач. Думала, можа, сястра. Падняла галаву і пачала гукаць. А яны ўзялі і выстралілі... Не трапілі. Я — зноў у балота. А вады поўна-поўна. Доўга ляжала. Ужо і есці захацелася. А побач — нікога. Праляжала да самага вечара.

Яна толькі потым даведалася, што немцы ішлі паліць суседнія Ананчыцы. Быў 1944 год...

### «Той, хто газеты друкаваў?»

Гэта адно з самых моцных узрушэнняў, якое ў яе, тады васьмігадовай дзяўчынкі, пакінула вайна. Калі, вядома, не лічыць таго, што з фронту не вярнуўся адзін з чатырох родных братоў. У вёсцы ж у асноўным было ціха. Вораг лютаваў дзесьці побач, а Камсамолец — тады Радацень — з'яўляўся невялічкім востравам бяспекі, акружаным лясамі.

Невыпадкова вёску аблюбавалі партызаны. Як успамінае Марыя Захараўна, партызанаў у іх была поўная хата. «Яны ў нас і жылі, і есці сабе варылі, — успамінае дзіця вайны. — Помню, ляжу малая на печы, а яны мяне смачненькім нечым частуюць. Такія харошанькія былі. І маці ім мая дапамагала: хлеб пякла, кругом усё рабіла».

Сярод партызанаў быў і Міхаіл Барашкаў. Хутчэй за ўсё, іншыя партызаны таксама былі задзейнічаны ў стварэнні або распаўсюджванні газет.

— Вы помніце Барашкава? — пытаюся ў Захараўны.

— А хто яго ведае! Гэта той, хто газеты друкаваў, ці што?

Але тое, што ў яе хаце некаторы час ствараліся газеты «Звязда» і «Чырвоная змена», жанчына памятае добра. Хоць, прызнаецца, самі газеты, якія выходзілі тады з-пад друкарскага станка, яна ніколі не бачыла.

Як яшчэ распавяла гаспадыня, шыльда на яе хаце вісіць сімвалічна. Гэты дом пабудавалі ў 1970-х гадах — такім чынам дзяржава вырашыла аддзячыць сям'і за дапамогу партызанам. Тая хата, дзе сапраўды выдаваліся «Звязда» і «Чырвоная змена», стаяла побач. Пасля вайны з яе зрабілі хлеў.

### Тыф-забойца

Тое, што падчас вайны ў вёсцы сапраўды размяшчаліся партызаны мінскага падпольнага злучэння, у свой час пацвярджала і мясцовая жыхарка Марыя Стасеня.

Вось што яна расказвала: «У 1944 годзе з-пад Скаўшына прыбылі партызаны, сярод якіх Міхаіл Парфёнавіч Барашкаў. Гэта быў высокі чалавек з вялізным чубам. Партызаны часта выходзілі па заданні. У той час лютавала страшная хвароба — тыф. Хутка захварэў і Міхаіл Парфёнавіч. Даглядала я яго разам з Соф'яй Самусевіч і Аленай Мухай. Мы па чарзе былі каля хворага. Заходзілі і яго памочнікі: Ніна Цылько, Мікола Курыка, Емяльян Шурпач. На вялікі жаль, Міхаіла Парфёнавіча не стала. Хутка і я захварэла на тыф. Ледзь выжыла...»

### Друкарскі станок на ўспамін

Марыя Іосіфаўна таксама ўспамінала, што на магілу Барашкава неаднойчы прыязджалі з Мінска яго паплечнікі. Нават захоўвала фотаздымкі тых сустрэч.


Марыя Захараўна ЧАРНЮК была яшчэ дзіцем, калі ў яе хаце ствараліся падпольныя газеты «Звязда» і «Чырвоная змена».

Не раз тут была і жонка Міхаіла Парфёнавіча. Яе добра памятае жыхарка вёскі Доўгае Тацццяна Хаміцэвіч, дзяцінства якой прайшло ў Камсамольцы.

— Я тады ў школу хадзіла, — успамінае жанчына. — Жонка Барашкава пастаянна прыязджала. Помнік гэты ўвесь час фарбавала. Калі не магла прыехаць, тэлефанавала ў школу, і магілку тыя прыбіралі мы. Самі плялі з дзеразы вянкі, рабілі кветкі. За гэта нас жонка Барашкава не раз частавала цукеркамі. Пастаянна гасцінцы вазіла. Мо з Мінска прыязджала ці адкуль? Кажуць, што яшчэ гады тры таму тут была. Праўда, ужо вельмі старэнькая.

Добра памятае Таццяна Хаміцэвіч і друкарскі станок, які застаўся ў Чарнюкоў у напамін аб вайне і партызанах. Жанчына даводзіцца свацькай Марыі Захараўне, таму ў хаце, дзе ствараліся падпольныя газеты, бывала не раз.

— Гэта ў іх цяпер хата новая, — тлумачыць жанчына. — Тады была маленькая драўляная — адным словам, звычайная вясковая хата. І там станок стаяў. Такі вялізны, квадратны *(паказвае)*. Лістоўкі там ляжалі: адны надрукаваныя, іншыя ад рукі напісаныя. Помню, бегалі па вуліцы і махалі гэтымі лістоўкамі. І ўвесь час прасілі бабульку, якая там жыла: «Пакажы, дзе газеты малююць». Хто яго ведае, куды потым той станок знік...

### Пахаваны пад хвоямі

Марыя Чарнюк, у хаце якой друкаваліся падпольныя газеты, таксама перанесла тыф. Яе маці з хваробай не справілася: хутка пасля вайны і памерла.

— Многа тады партызанаў пахварэла, — успамінае Марыя Захараўна. — Як даведаліся, што побач немцы, ужо знясіленыя, паўцякалі ў лес. Тут, у лесе, літаральна за нашым агародам, некаторыя і паўміралі. Хавалі іх ужо пасля вайны.

Свайго рэдактара і старэйшага таварыша журналісты-падпольшчыкі пахавалі адразу. Вось што пра апошнія дні яго жыцця напісаў супрацоўнік падпольнай і мірнай «Звязды» Емяльян Шурпач: «Прыйшла бяда — у сыпным тыфе зваліўся рэдактар. Доктар С.М. Шавец сказаў, што Барашкава не адолеў бы тыф. Але ў яго на грудзях была рана, атрыманая яшчэ на фронце. Аслаблены арганізм рэдактара не вынес. І на дзявятыя суткі хваробы Міхаіла Парфёнавіча не стала. Пахавалі яго пад трыма хвоямі, якія раслі на ўскрайку вёскі...»

Пад тымі самымі хвоямі, якія і сёння берагуць вечны сон адважнага партызана і таленавітага рэдактара, а таксама яшчэ дваіх, хто таксама змагаўся за мірнае неба над сваёй Айчынай.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**
*Салігорскі раён*

***Аўтар выказвае падзяку начальніку аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Салігорскага райвыканкама Ларысе Жукавай і галоўнаму спецыялісту сектара культуры аддзела Ганне Носавай, а таксама старшыні Доўгаўскага сельскага Савета Уладзіміру Дрывіле і Мікалаю Хаміцэвічу, нашаму падпісчыку, за дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі.***



Побач з Міхаілам Барашкавым пахаваны два невядомыя партызаны.



Рэдактар «Звязды»-партызанкі Міхаіл Парфёнавіч Барашкаў пахаваны на ўскрайку вёскі Камсамолец.